БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

...рэс рэдакцыі і адміністрацыі:
...ухоуская вул. д. № 12

...цыя адчынена ад 1 да 2 гадз. ...асьля поудня.
...істрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

...цыя пакідае за сабой права па... ...ць перасыланыя рукапісы і карэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Надпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 ру[illegible] на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

...62. Менск. Субота 8 чэрвеня 1918 г. Год I

Менск 8/VI.

...часу выбарнага закону у ...дарсцьвенну Думу у Расіі ...ліся тры сыстэмы выбар... права, нават у самых ...ках ведаць аб «выбарах». ...а наглядзець, як жа ад...рся насяленне да гэтых ...ау!

...сунак народу да выба...ыу як раз праціуны ста... пацiху паміраушай са...ржаунай улады да народу. ...мпарыя» так захоплена імпэрыялізмам, зьбіраннем ...лькі «всея Россіи», але і ...іх закрайсьветных абша... што праглядзела Эуро...кае разьвіцце і культуру. ...каунай палітыка дауней... Расіі ішла дарогаю, калі ...а так сказаць, экстэн...ацыі а не інтэнсіфікацыі, ...аго пашырэння сваіх уп...у на лежаушыя па рубя... землі, а ні разьвіцця ...адзка-культурных сілау у ...зіне уласнай дзержавы.

...ычайныя спасыланна на ...кытую некалі татаршчыну, ... нічога нівартая адгаворка ...ырай ніколі Масквы.

... вось улада у Расіі уста... такія адносіны да народу. ...баялася: уцякала ад яго. ...ьеріе» улады народ—ад...у сабе бунтамі і рэвалю...ымі выбухамі.

...атуральна, што заваявау... сабе права гаварыць, на...ад яго спадзевауся імат ... і на выбары глядзеу зау... з вялікай надзеяй.

...адзеі павялічываліся тым ...й, што тыя хто ішчыра ...у з народам абяцалі яму выбарных установ цэлыя ...ы, дэкларавалі усякія зьме... заразжа.

...ыбарнае права дадавае на ...тку царскім урадам ні ... ідэяльным. Ні было агуль..., ні пасрэднім, роуным, ні ...увауся прынцып прапар...нальнасьці. Аднак і яно па...лося занадта шырокім і ... зьменено перад выбарамі ...трэцюю» Думу. Пры цэн...ых і ні аднаступенных вы...ах народ быу пазбаулен ...ымасьці мець сваіх прэд...унікоу там дзе павінен быу ...ь.

Рэвалюцыя дала Расіі выбарныя законы Керэнскаго. Трэба прызнаць іх надта лібэральнымі і для народау насяляушых Расію амаль што ні ідэяльнымі. Імі на праудзі увесь народ дапушчауся да станауления аб сваой долі. Але яны прышлі надта ніспадзевана і пры том у нінармальны час. Тое, што магло ашчасьлівіць усякі інты край, у Расіі павялічыло толькі ніпарадак, даушы імпэту партыйнай барацьбе, замацавауша дэмагогію. І разумеецца ні да чаго ні давялі, як наагул ні да чаго ні даходзілі усе лепшыя пачынання рэвалюцыйных урадау. Бо для з'ішчэння такога права, для добраго яго выкарыстання, патрэбен нейкі дзержауны лад і грамадзкі спакой, каторых ні было.

Выбарная працэдура, толькі болей популярызавала у народзе большэвікоу, каторыя праз нейкі час скінулі і Керэнскаго і усе раней выданыя законы.

І вось мы бачым цікавую рэч. Большэвікі, гэтыя левыя з левых, пастараліся, як толькі забралі сілу скасаваць агульнае выбарнае права і пазачынялі усе выбраныя гэтым правам установы.

Прычынай гэтаму тое ж самае што і у даунейшаго царскаго ураду нідавер'е да народу. Але гэто толькі наверхоуна здаючаяся прычына, самая ж суць у тым, што большэвікі захацелі у канцы *запыніць рэвалюцыю і даць Расіі лад.* Прауда лад соцыялістычны, але гэто ні меняе справы Большэвіцкая дыктатура палягае натым што у пераходныя мамэнты ні можа быць улады залежачай ад выбаршчыкау. Каб зьмяніць стары парадак і палажыць пачатак новаму, патрэбна моцная рука, акая усе рабіла-б. Можа і ні саусім трапна для будучывы але *адна.*

Аднак гэтым іпчэ ні касуецца самая ідэя ні адкідаецца думка аб дэмократычным выбарным праве. Яно павінна прыйсьці і заняць патрэбнае мейсцо у жыцці, як толькі наступіць нейкі лад і адкрыецца магчымасьдь органічнай працы.

Выбары па законам часу Керэнскаго адбываліся і на Беларусі, але як яны ішлі гэта усім ведама. Праудзіваму дэмакрату гледзючы на гэтую процэдуру плакаць было трэба. І у скутку іх пауставалі установы ніздатныя да— жыцця. Вінаваты былі у гэтым ні выбраныя людзі, але час, каторы зрабіу іх у вачах народа мешканцамі неба, адразу спасобнымі усе даць і зрабіць. І вось яны стварылі праэкты... у пустую, бо ні мелі чым іх рэялізаваць. А бы-б здаволіць чакане сваіх выбарау. Але праз гэто сама ідэя дэмакратычнага выбарнаго права ні павінна нічога траціць. Спакойны час зноу павінен вярнуць яго да жыцця.

Уся будова беларускаго дзержаунаго і грамадзкаго быту павінна апірацца на гэтым праве і чым хутчэй, яно будзе уводзіцца у жыцце тым лепі і карысней будзе для Беларусі і яе унутранай згоды.

Прэемство культуры.

З гісторыі мы бачым уплыў больш культурных народаў на адстаючых. Эгіптяне пераняллі культуру ад ассырыян і вавілонян і самі посьля мелі вялікі уплыў на развіцце культуры жыдоўскай і грэцкай. Даволі памянуць, што праводаўца жыдоў Моісей атрымаў выхаванне у вельмі вучоных жрэцоў эгіпскіх. Грэкі так развілі сваю культуру, што і да гэтаго часу мы дзівімся іх навуцы і штукарству. Латыняне, пакуль разьвілі сваю ўласную культуру, старанна вучылі ўсё грэцкае, але яны ні маглі аперэдзіць грэкаў. Толькі ў юрыспрудэнцыі латыняне пакінулі нам ўзоровыя прыклады сваіх праў. Жыды далі сьвету пачатак хрысьціянскай культуры, каторая зрабіла людзей трошкі лепшымі. Эўропэйская культура разьвілася на грунці культуры латынскай і грэцкай. Эпоха адраджэння у Эўропі пачалася з стараннаго вучэня клясcікаў грэцкіх і рымскіх, бо да гэтаго часу хрысьціянская цэркаў забараняла чытаць творы пісьменнікаў паганцаў. Навукавою моваю у Эўропі да 18-го веку была мова латынская. У канцы 19 веку найбольш развілі эўропэйскую культуру немцы. Літэратура нямецкая найбагатшая. Можна сказаць, што знаючы толькі гэту літэратуру можна навукова працаваць у рожных крэсах.

Што тычыцца славян, то іх культура развіваецца глаўным чынам пад уплывам нямецкай, бо немцы найбліжшыя іх суседзі. І калі культура захадніх славян: палякоў і чэхоў дапяла высокаго стопня развіцця, то гэта дзякуючы таму, што яны многаму навучыліся ад немцаў. Петр I наўмысне ездзіў вучыцца у нямецкія краі. Яму і яго насьледнікам удалося збудаваць імпэрыю за помаччу немцаў, служыўшых у Масковіі. Уся руская навука знайходзіцца пад моцным уплывам нямецкай. Рускія вучоныя, каб стаць імі, працуюць у нямецкіх універсітэтах і ад іх дастаюць марку па вучоны стопень. Нізалежнае рускае навукі німа.

Мы, беларусы, у 18-ум веку былі пад моцным уплывам нямецкай культуры. Магнаты нашы ездзілі у Германію вучыцца і пераналі адтуль протэстанство. Цяпінскі пераклаў на беларускую мову евангелё. На бяду нашу, с прыходам езуітаў кончыўся ўплыў пратэстанства і нямецкай культуры, і у нас пачалася полёнізацыя.

У цяперашні момэнт, калі вайна, гэты экзамэн на цывілізованнасьць нацыі, паказаў, як высока стаіць нямецкая культура, і нашай інтэлігэнцыі з народа, трэба прылучыцца старанне да нямецкай культуры. Калі сярод нас беларусаў ні будзе людзей, знаючых добра нямецкую мову, тагды усе нашыя зносіны з немцамі, будуць ісьці праз жыдоў, знаючых нямецкую мову, або палякоў, што ім, а ні нам дасьць кіраўнічае становішчо ні толькі у гаспадарцы, як гэта было дагэтуль, але і у грамадзянскім жыццю.

Значыць мова нямецкая павінна быць абавязковым прадметам ва усіх вышэйшых вучылішчах, пачынаючы з ніжэйшых, каб мы пры помачи яе сталі грамадзянамі сьвета.

X.

Агульныя весткі.

СТАКГОЛЬМ, 4/VI. «Dag. Nyh.» паведамляе з Гельсінгфорсу: ўчора па поўдні Фінляндцкі Сэйм прыняў прачытаны мірны трактат паміж Фінляндзіяй і Нямеччынай.

БЭРЛІН, 4/IV. На сягоняшнім заседані Рады Зьвязку ратыфікованы трактат мірны паміж Нямеччынай, Аўстро-Вэнгрыяй, Баўгарыяй і Турцыяй з Румыніяй.

ГААГА, 4/VI. З «Le Havre» паведамляюць: Старшыня бэльгійскаго габінэту Броквіль падаўся да адстаўкі. Яго мейсцо заняў міністар Корэман.

ШТОКГОЛЬМ, 4/VI. С Пецярбургу паведамляюць, што паводлуг дэкрэту маскоўскаго савецкаго ўраду—на абшары пад гэтым урадам с 1-го г. м. уводзіцца абавязковая праца для усіх грамадзян.

ПАРЫЖ, 3 гм. «Havas». Сягодня перад поўднем Клемансо у ваеннай камісіі рабіў высьнення датычучыя ваеннай сытуацыі і ужывання коаліцыйных войск. Тутэйшыя газэты кажуць, што высьнення Клемансо зрабілі ўражэнне што дэбаты аб гэтай справе назначаныя на заўтра, ні адбудуцца і ініцыятары ні будуць на іх настаіваць.

ЦУРЫХ, 4 гм. «Вольф». Жалежнадарожная лінія Рэймс-Эпэрнэй находзіцца у сфэры агня нямецкай цяжкай артылерыі. У шмат якіх мейсцох памяненая лінія ні можа працаваць і ваенныя матэр'ялы перадаюцца на фронт акольнымі дарогамі.

«Zurcher Tagesanzeiger» кажа, што дзеля таго што новыя сілы нямецкія пасунуліся пад Марну, французы страці-

лі важную манэўровую і транспортную лінію паміж фронтам у Шампані парыжскімі лягерамі. Рухі, францускіх войск ужо ад некалькіх дзен павінны ісьці шмат далейшай дарогай праз Монтміраль—Эзэнн і Труайс.

Лісты з вескі.

IV.

Атпадае ахвота і пісаць: зіма чым пахваліцца. Большэвікі сваім новым календаром збілі с толку і вясну: пачалася яна нібы то па іхняму распісанню, але пасьля, як начали браць верх анархісты пачалася анархія і на дварэ. Ад раннаго згону сьнегу ажно да паловы маю—ані кропалькі дажджу; у дзень—вятры, ноччу—маразы.

У Менскім, Барысаўскім, Вілейскім і Дзісьненскім паветах большасьць жыта засохла і позна ужо яму папраўляцца: аснова—выплыла, падсада—прапала. Садам маразы нідалі і зацвісці—так піраспусьціўшыяся пучочкі замерзлі і абы дакрануцца да іх—асыпаюцца. Менш баяліся слівкі і грушы, але з яблыкамі — саўсім дрэнна. Ранныя пасевы ярыны сядзяць пры зямлі—мала цепла у нашай зямлі, каб пагнаць іх у рост; адзін гарох цьвіцца, што на яго ворагаў—мошак прышла пагібель, дык пакуль што толькі ён казырыцца. Лугі—як бубны: да паловы маю як рагатую скаціну, так авечкі і коні пасьвілі скрозь, бо іншай пашы ні было, а у хлявох трымаць ні было пры чым.

Зважаючы на ўсе гэткія варункі, здавалося і рукі трэба было б апусьціць, але наш беларус—заўзяты народ да гаспадаркі — ён адно чаўпе: «прышоў Мікола (9-го маю ст. ст.)—сей наукола» і сее: сее, прыказваючы за кожным разам: «што людзям—то і нам». Трэба адзначыць, што сёлета насення рожнаго павэдлуг абшараў—у вёсках—лішніца, а на дварох і фальварках—вялікая нідастача, дык шмат зямлі пустуе. Ось і пачалі нашыя селяне перш-наперш с таго, што абсеялі ўсе лепшыя кавалкі: бульбу пасадзілі на палову—«што людзям, то і нам».

Праўду кажучы, як вы і самі з гэтаго бачыце, тут ні саўсім ужо так, каб «што людзям, то і нам»: «людзям» як бы выходзе крыху больш, чым «нам», але селянін-беларус да гэтаго прывык і калі цярпеў дагэтуль, то пацярпіць іщчэ, трэба спадзевацца, крыху. І ўсё было б добра, каб ні гэта надворная анархія: у дваццатых чыслах маю сыпнуў замест дажджу—сьнег, ды з гэтакім віхром, што гібель лесу паламало, шмат у садох пагуміло драў, паздзірало стрэхі, а нікаторае і жыто паклало, а ў дадатку ночччу стукнуў гэткі мароз, што ваду лёдам сьцягнуло, а ў награду рупнейшым гаспадаром саўсім змарозіло абышоўшую раннай пасадкі бульбу. Ад гэтаго часу да пачатку чэрвеню перападалі дробныя, халодныя асяньчукі—дажджы, а 1-го чэрвеню сыпнулі крупы, на жаль толькі, што ні манновыя, а лядовыя, ды ізноў пачаліся дробныя халодныя дажджы. Нівядома, як гэта адаб'ецца на ярыне, але жыта на цяплейшых грунтох усё ж такі крыху папраўілося. Словам: гаспадарка—клапатарка—старая праўда.

А цяпер можа хочыце ведаць, як мы жывем і якія ў нас цэны? На жыта—цэны німа: ні то хто сколькі дасьць, а хто колькі зьдзярэ—прымерам, па рублёў 80 за пуд. Ячмень—35 р.; авес—20—25; бульба—5—7; сланіна—6—8 і 10 рубл.; млека дастаць трудно, бо скаціны мала, а цяпер, бадай, і саўсім ні купіш, Успаміпаюць і аб цукру—па 8 р. за фунт, але на гэта трэба апрача лішніх грошы мець вялікае знаемства і сяброўства; дык калі хто ўжывае гарбату, чы замест яе іншае якое зелле, то пье ні у прыкуску, нат ні ў наглядку, а толькі з гутаркай аб цукру.

Колькі ж абходзіцца харч у дзень на чалавека? Буду лічыць павэдлуг цэн, якія былі у Менску месяц таму назад (цяперашніх ні ведаю) у самай таннай сталовай—Ігнатычах.

А 4-ай гадз. раніцы бярэмся да работы, дык у 7-ай ужо сьнеданне: тры поў—порцыі бліноў (на наш аршын—гэта тры бліны) па 1 р. 50 к.= 4 р. 50 к. і 2 порцыі (па нашаму малая місачка) кваснаго млека па 1 р. 50 к. порцыя=3 р., ўсяго 7 р. 50 к. Палудзень а 12-ай: 2 порцыі кіслай стравы—па 65 к. =1 р. 30 к. да гэтаго 3 порцыі хлеба (менш ¼) па 45 к.=1 р. 35 к. і 1 порцыя прэснай—65 к., разам палудзень 3 р. 30 к. А 5-ай гадз. падвячорак: 1 шклянка млека —65 к. і 3 порц. хлеба— 1 р. 35 к.=2 р. А 9-ай— вячэра: 2 порц. прэснай стравы па 65 к.=1 р. 30 к. Гэткім чынам кошт харчу за увесь дзень выпадае 14 р. 10 к.

Ціха—ні рабіце гвалту, што мы буржуі, столькі праедаем порцый. Зайдзіце у Ігнатычы, зьмерце гэтыя порцыі і поўпорцыі і вы пераканаіцеся, што жыць імі можа толькі той, хто пераседае з аднаго на другое заседанне, а мы толькі і сядзім, калі ядзім. Праўда, ні што дня есьці бліны [мы іх глумім 2 разы на тыдзень], але ў мяне ані слова німа аб мясе, аб скварцы, з якімі так сама час ад часу трэба спаткацца, а поў—фунтам хлеба на дзень ні абойдзішся. Цяпер скіньце на кватэру, сьвятло, дровы і інш. рожніцу расходаў паміж местам і вёскай—дзьве часьці кошту, то і так штодзенна харч на душу выпадзе каля пяці рублёў.

Я кінуўся аб усіх гэтых драбязгах дзеля таго, што цяпер шмат ўцекае з места на вёску. думаючы што тут аб чым абыйсьціся. Мінуліся тыя часы. Калі ж бы нам—вясковым працаўніком прышлося урэзаць гэтыя штодзёвыя порцыі, то нашыя рукі, нашыя ногі справілі б гэткі саботаж, з якім німяркавацца і чыноўнікам быўшаго расійскаго міністэрства.

Я. Ш.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоўн[ага] камандавання за 6 чэрвеня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

Артылерыйская дзеяльнасьць меняючайся сілы. Ра[з]дачныя баі давалі наіднакратна палонных.

Група арміяу Германскаго Кронпрынца.

На фронце становішчо без перамен. Мейсцовыя бі[твы] захадней Пантуаза, паўночней р. Эн і на поўначы далі [м]ажлівасьць заняць варожыя акопы і укрыцці. Артылер[ый]скія бітвы шмат разоў ажыўляліс. Шато Тьерры доўга стрэліваўся францускім руйнуючым агнём.

Трафэі группы эрміі Гэрманскаго Кронпрынца да 27 мая: болей 55000 палонных паміж імі 1500 афіцэраў [бо]лей 650 орудзій і шмат болей 2000 кулямётаў.

За два апошнія дні зьбіто 46 варожых аэроплянаў [і] 4 прывязных шары.

Руйнуючы адрад Рыхтгафэн зьбіў учора 15 варож[ых] аэропляпаў, капітан Бэртодльд і лейтэнант Менкгоф з[бiлi] сваю 31-ю, лейтэнаят Левенгардт сваю 26 і лейт. Кірш[т] сваі 21 і 22 ўваздушныя перамогі.

Першы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Весткі з Расіі.

— **Ангельцы на Мурмане.** Штокгольмскі коррэспондэнт «Voss. Ztg.» Тэодор Бэрманн падае цікавыя падробнасьці аб сытуацыі на Мурмане, атрыманыя ім ад годнаго веры чалавека, паддаваго аднэй з нэйтральных дзержаваў, каторы нідаўна быў на Мурмане.

Тая думка, што коаліцыя у поўночнай Расіі заняла толькі нікаторыя пункты, аказуецца абмылковай. Па праўдзі-ж коаліцыя распасьцерла тамака сваю ўладу на шырокую тэрыторыю ад поўатокі Канін да фіорду Гэарангэр т. е. каля 30° географічнай даўжыні. Такім чынам коаліцыя зачыніла Белае море і пануе на усёй поўначы Эўропэйскай Расіі з яе важнымі складачнымі пунктамі як Архангельск, Онега і Мезень. Ад «Канінскаго Носа» на ўсходзе і да Рыбацкай атокі на заходзе рэйсуюць ангельскія дазорныя караблі і увесь палудневы абшар знаходзіцца пад ўладай начальніка ангельскаго мурманскаго флоту, контр-адмірла Кампа, катораго главная кватэра знайходзіцца у Александраўску а флот мае мейсцо паміж Аленяй атокаю і Кольскай Затокай. 4 радзіостанцыі за помаччу якіх адмірал зносіцца з другімі пунктамі абслужываюцца ангельскімі, францускімі і арэрыканскімі ахвіцэрамі. У многіх пунктах Мурманскаго пабярэжжа, на Мурманскай жалезьніцэ аж на поўдзень ад Кандалакшы і на атоках, функцыі адміністратыўнай ўлады споўняюць ангельскія ахвіцэры. Прадукты даставляюцца з Норвэгіі, на параходах «Таварыства Мурманскаго судаходства», каторыі запраўляюць ангельцы. Апрача карабельных камандаў на паказанай тэррыторыі знайходзіцца нікаторая лічба сухапутнаго войска. Падчас побыту тамака асобы, ад якой паўзяты інформацыі, на Мурмане, у Екацерыноўцэ і Аляксандраўску было ангельскаго войска: 500 чалавек пяхоты і 100 чалавек інжынерных войск пры 60 ахвіцэрах. У канцы мая прыбыло іщчэ 15 францускіх ахвіцэраў і 9 амэрыканскіх. Главныя ангельскія сілы, 5000—6000 чалавек стаялі каля Печангскай і Барысаглебскай на захад ад Александроўска.

Мейсцовае насяленне складаецца з Японцаў, каторых паддавства ні здолеў бы установіць найлепшы прафэсар, і рыбакоў—рускіх саусім ні культурных і нісьвядомых. Больш культурным і рэагуючым на цяперашнія выпадкі ёсьць насяленне нідаўна паўстаўшых рыбацкіх пунктаў ўздоўж Мурманскай жалезьніцы ад Кемі да Колы. Пасьля выбуху рэволюцыі гэтыя калоніі а так сама насяленьня і большыя сёлы як Кола, Александраўск і іншыя стварылі ідучы за прыкладам усей Расіі мейсцовыя «Саветы». Ангельцы гэтых «саветаў» і ні думаюць чапаць. За тоя чырвона гвардэйцы, каторыя каля 500 чалав. прыбыўшы сюды с Пецярбургу пачалі рабаваць, красьці і пропагандіраваць большэвіцкія ідэі былі зараз выдалены ангельцамі на заход.

Старшыня Александраўскаго савету Галанкін гаварыў асобе падаўшай інформацыі, што Мурманская тэрыторыя павінна аддзяліцца ад Расіі і стварыць пад протэкторатам Вялікабрытаніі рэспубліку у склад якой войдзе і г. Архангельск.

Праз «Dz. Wil.»

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Аб забароне прыема царскіх грошай па лініі Л. Р. ж. д. ад 10 чэрвеня выдан прыказ нямецкімі жалезнадарожнымі уласьцямі.

Цукровы пясок, соль, сушаныя агароднівы і серникі, як абнародавала меская харчовая камісія, будуць адпускацца насяленню у асоба выбраных 37 бонавых крамах, па жаданню у гатовых паперавых мешках, па цане ад 2-х да да 10-ці кап.

Цэлая группа крам, ра[н]... адпускаушых гэтыя прадук[ты] зачынена.

Дрэнна толькі тое, [што] большасьць крам, замест 5 чэрвеня, фактычна адпусьц[iлi] насяленню такія патрэбн[ыя] прадукты толькі у панядзел[ак] 10 чэрвеня.

У пятніцу, 7-го чэрвеня кр[ам]нікі яшчэ уносілі грошы [за] гэтыя прадукты.

Беларуская сталоуна, зап[...] на якую усьпешна ідзец[ца] Белар. Народным Прэдст[аў]ніцтве, (Серпухоуская, 12), [маг]ла быць адчынена пры «Хац[е]» на конным пляцу.

Цяпер, с пераходам юбіл[ей]нага дома пад кірауніц[тва] Прэдстауніцтва, праэктуец[ца] уладзіць у ім, па ініцыатыв[е] старшыні „Бел. Хаты" Ф. Ве[р]нікоускаго, і сталоуку, [...] трэба толькі відаць каця [...] с камэрчэскаго погляду—у ц[эн]тральнай часьці места.

Плата за абед, з двух стр[аў] —2½ р. месячно—75 руб.

Канцэрт, два водэвілі і та[н]цы адбудуцца сягоння, 8 ч[эр]веня, а 6 гадзіне вечара [у] «Беларускай Хаце» пад кір[аў]ніцтвам таланнаго знатака сьпеваў Цераускаго.

Публіка, пэуна, зьверне сва[ю] увагу на цікавы, добра п[а]стаулены хор.

Утварэнне беларускаго ко[о]пэратыва пры юбілейным д[о]ме на новых пачатках (ініцы[я]тыва Ф. Вернікоускаго)—спр[а]ва бліжэйшаго часу, спра[ва] вельмі добрая.

Ф. Вернікоускі прапану[е] дзеля гэтай мэты пад зас[еў] агародніны 10 дзес. зямлі.

Здача спраў бываўшымі у[п]раускімі дзеячамі, Кашчэнка і Зальмановам, а так-сам[а] главарамі усіх меськіх каміс[ій] і падкамісій, сваім прэемніка[м] па назначэнню, Хржонстоуск[о]му і «5» яго радчыкам, ідзец[ь] вельмі хутка і гэтымі днямі закончыцца.

Фільтроука канцэлярскаг[а] пэрсоналу б. меськ. управы [і] зьменьшэнне штатау пакул[ь] затрыманы да аканчацельнаг[а] укамплектавання магістрату цэлым.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грыбаята.